# 2. АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ФИЛОЛОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ В XXI ВЕКЕ

УДК 821.161.3 В.Быкаў

## ТЭМА ЗДРАДНІЦТВА Ў АПОВЕСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА “ЗНАК БЯДЫ”

## THE THEME OF BETRAYAL IN V. BYKOV'S STORY "THE SIGN OF TROUBLE"

Н. В. Гурская
N. V. Hurskaya
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка;*
*Навук. кір. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

Звяртаецца ўвага на адну з ключавых тэм аповесці В. Быкава “Знак бяды” – тэму здрадніцтва. Разглядаюцца вобразы здраднікаў, выяўляецца матывы іх здрады.

Attention is drawn to one of the key themes of V. Bykov's novel “The sign of trouble” – the theme of betrayal. The images of traitors are considered, the motives of their betrayal are revealed.

Ключавыя словы: В. Быкаў; “Знак бяды”; здрадніцтва; вобразы здраднікаў.

Keywords: V. Bykov; “The sign of trouble”; betrayal; images of traitors.

Васіль Быкаў увайшоў у гісторыю беларускай і сусветнай літаратуры як праўдзівы летапісец Вялікай Айчыннай вайны. Імкненне пісьменніка да жыццёвай праўды абумовіла яго зварот да тэмы здрадніцтва. “В. Быкаў амаль ва ўсіх творах ваеннай праблематыкі даследуе псіхалогію і спрабуе зразумець матывацыю тых людзей, што сталі прыслужнікамі акупацыйнага рэжыму” [2, с. 201]. Гэта праблема даследуецца і ў аповесці “Знак бяды” (1982) і раскрываецца праз вобразы паліцаяў. Аўтар шукае адказ на пытанне, што прывяло чалавека да таго, каб служыць ворагу.

Галоўным паліцаем у аповесці “Знак бяды” з’яўляецца Зміцер Гуж. Гэта чалавек, які вылучаецца асаблівай жорсткасцю і прынцыповасцю, ён гатовы пайсці на ўсё дзеля ўлады, дзеля помсты і дасягнення сваёй мэты. Такім Зміцер быў з самага юнацтва: “Бывала, падлеткам абтрасаў сады, глуміўся з меншых, пляжыў гародніну ў Выселках. Калі ў суседа Карнілы завёўся сабачка, які не даваў Гужу разбойнічаць паначы, дык той злавіў яго, удышыў і павесіў у Карнілы ў шуле” [1, с. 144]. Яшчэ да вайны Гуж палохаў людзей, сустракаў іх з абрэзам у руках, асабліва гэта датычылася сям’і Багацькаў. Такое стаўленне Зміцера Гужа да Сцепаніды і Петрака было невыпадковым. У час, калі ў краіне адбывалася калектывізацыя, Сцепаніда прымала актыўны ўдзел ў гэтай справе (“акцявістка” – так яе называў пазней Гуж). На адным са сходаў было ўзнята пытанне аб раскулачванні бацькі Зміцера Гужа. Сцепаніда, як і некаторыя іншыя ўдзельнікі схода, была супраць гэтага, але абараніць аднавяскоўца не атрымалася: “А ці правільна гэта? – набраўшыся духу, сказала Сцепаніда. – Раскулачваць, каторыя кулакі. А Гуж серадняк. Не, я не сагласная” [1, с. 106]. З таго часу жаданне Зміцера адпомсціць той, хто, па яго перакананні, раскулачыла яго бацьку, сапсавала яму жыццё, стала вельмі вострым.

Падчас вайны Зміцер атрымаў вялікую ўладу, ён сам гэта прызнае: “Я ўсю жысць быў падначалены, малы чалавечак. Усяго бойся. А цяпер у мяне ўласць! Поўная. Я ж цяпер для вас вышэй, чым сельсавет. Вышэй, чым райком. Чым саўнарком нават. Я ж магу любога, каго хочаш, стрэльнуць. Мне ўсе давяраюць” [1, с. 170]. Нянавісць, што ўзрасла ў душы Гужа, не давала спакойнага жыцця сям’і Багацькаў. Паліцай разам са сваімі памочнікамі часта прыходзіў да іх і кожны раз даваў новыя загады.

Жорсткі, бязлітасны і прамалінейны – усе гэтыя якасці характарызуюць Гужа. Зміцер лічыў, што ўсё павінна належаць яму; непаслушэнства ён хутка адсякаў нават адным толькі з’едлівым позіркам. Так здарылася і з Петраком, які, каб мець магчымасць адкупіцца ад крыўдзіцеляў, пачаў займацца вырабам самагону. Гуж не жадаў чуць адмовы: “Толькі хай не здумае ад мяне таіцца. Галаву адкручу і скажу, што безгаловым радзіўся” [1, с. 170]. Сапраўды, паліцай не шкадаваў нікога, грунтоўным доказам гэтага з’яўляецца момант, калі Пятрок упершыню вырашыў выказаць тое, аб чым доўгі час маўчаў. Гуж жорстка тузаў аднавяскоўца, што нават даводзіўся яму сваяком, і глядзеў на тое, як боль праймаў старое цела.

Жаданне адпомсціць за неіснуючыя грахі Сцепаніды, улада, якою быў надзелены Зміцер, поўнасцю знішчылі ўсё чалавечае ўнутры паліцая. У Гужа была свая праўда, якой ён непахісна прытрымліваўся.

Іншы здраднік, Патап Каландзёнак, вылучаецца сваёй маўклівасцю і знешней абыякавасцю. Аднак на самой справе паліцай быў не такім спакойным і простым, як гэта здавалася адразу. У даваенныя часы Патапка ахвотна служыў савецкай уладзе: цэлымі днямі сядзеў у сельсавеце і заўжды слухаў тое, аб чым гавораць дарослыя. Калі была патрэба каго-небудзь паклікаць, то заўсёды пасылалі хлопца: “Заўжды ён быў сам па сабе, адзін – ці ў вёсцы, ці па дарозе ў школу, ці ля статка ў полі. Падросшы, пачаў гарнуцца да тлумных клопатаў і спраў дарослых…” [1, с.153].

Аднавяскоўцы давяралі, здавалася, ні ў чым непрыкметнаму хлапчыне. Але аднойчы Патап напісаў паклёпніцкі данос на Карнілу, за што атрымаў рэквізаваныя боты: “Яна [Сцепаніда. – *Н. Г.*] не мела слоў у галаве, каб сказаць яму ўсё, што адчувала, але было пэўна, што адчувала адну толькі брыду да гэтага маўклівага пераростка, які сваёю ўвішнасцю нарабіў такога, што хіба сам не разумее чаго. Гэта не Зміцер. На Зміцера зірнеш, і адразу відаць, што ён табе можа зараз зрабіць, а што заўтра зробіць гэты маўчун, таго не ўзнаеш” [1, с. 153].

Маўклівы і знешне бяскрыўдны Каландзёнак аказаўся злавеснай натурай, здольнай старанна і бяздумна выконваць любыя загады начальства. За абыякавасць у адносінах да іншых людзей, відаць, і любіў Гуж Патапа. Пры выкананні крывавых даручэнняў у паліцая, здаецца, не было ніякіх чалавечых пачуццяў, ён быў гатовы на ўсё дзеля дасягнення пастаўленай мэты:

“– Ану, дай яму!

Каландзёнак сігануў цераз верхнюю жэрдку плота, па растаптаных баразных ступіў да яго і размахнуўся. У Петрака зазвінела ў вуху, сяліба хіснулася ўваччу, і ён нечакана апынуўся на мулкіх каляных калівах бульбоўніку” [1, с. 198].

Пра тое, што Пятрок займаецца вырабам самагону, паліцаям з іншай вёскі таксама расказаў Каландзёнак, пазней гэта прынесла вялікую бяду ў сям’ю Багацькаў. Аўтар шматразова адзначаў патаемнасць і пры гэтым бязлістаснасць Патапа Каландзёнка: “Ну і гад! – падумаў Пятрок. – Чаму яго маці не прыдушыла малога? Гэты ж горш за Гужа. З тым хоць пасварыцца можна, неяк апраўдацца, а гэты адразу хапаецца за вінтоўку” [1, с. 161].

Патап Каландзёнак пры любой уладзе застаецца вельмі небяспечным і непрадказальным чалавекам. Асабліва ярка яго самыя горшыя, прыхаваныя якасці праявіліся ва ўмовах нямецкай акупацыі.

Самым "бяскрыўдным" сярод высялкоўскіх паліцаяў падаваўся Антось Недасека. Сцепаніда і Пятрок добра ведалі гэтага чалавека яшчэ ў мірныя часы. Антось меў брата Новіка, які з'яўляўся адным з кіраўнікоў падчас калектывізацыі, што пазней, з прыходам немцаў, як лічыў Недасека, стала вялікай бядой у яго сям'і. Сам Антось быў актыўным удзельнікам калгаснай справы. Варта звярнуць увагу на тое, што падчас прыняцця рашэння аб раскулачванні Гужа, Недасека адзіны, хто пачаў успамінаць моманты, калі бацька Зміцера наймаў людзей на працу, што адыграла значную ролю: "І гэта… Жаць памагалі, – узрадаваны сваёй кемлівасцю, гаманіў малодшы Недасека" [1, с. 108]. Калі пачалося галасаванне, Антось таксама самы першы аддаў свой голас за раскулачванне Гужа. Дзіцячая дурнота, якая жыла ў дарослым розуме, праявіла сябе. Прычым сам Недасека не бачыў у сваіх учынках нічога дрэннага.

З жаданнем захаваць сваё жыццё, нягледзячы на тое, што дзеля гэтага трэба зрабіць, Антось Недасека стаў паліцаем. Антось быццам бы і добра ставіўся да іншых, паводзіў сябе так, як і ў даваенныя часы, таму Сцепаніда і Пятрок не баяліся яго ўвогуле. Калі паліцай застаўся пільнаваць Сцепаніду, ён ветліва папрасіў паесці ў гаспадыні, чым яна была здзіўлена і параўнала яго з ягнём. Недасека шчыра верыў у тое, што занятак, які ён абраў, захавае яму жыццё, Антось надта баяўся смерці: "Што ж мне было рабіць? Лепей у зямлю класціся? З такім братам… Некалі дык быў пачот і павага, а цяпер? Цяпер адзін паратунак – паліцыя" [1, с. 174].

Вера ў тое, што ён выратоўвае дзяцей, кіравала ўчынкамі Антося Недасекі. Ён прыкрываўся гэтай думкай, хаця на самой справе дбаў толькі пра захаванне ўласнага жыцця. Дзеля гэтага ён быў гатовы павесіць свайго роднага брата: "Вот ты дзіўная, цётка! Дысцыпліны не ведаеш. Загадалі б – павесіў бы. А то самога павесілі" [1, с. 174].

Недасека шчыра верыў, што прыстасавацца да абставін было лепшым выбарам у той час: "Уласці заўжды дагаджаць трэба. Хоць савецкай, хоць нямецкай, а як жа, – глабакадумна заключыў Недасека" [1, с. 180].

"Вайна, канешне, нікому не ў радасць, лічы – усім гора, але калі тое гора праз немца, чужынца якога, дык што ж тут і дзівіцца, гэта як мор – чума ці халера, тут на каго наракаць? Але калі гэтая чума праз сваіх, вясковых, тутэйшых людзей, вядомых усім да трэцяга калена, якія раптам перасталі быць тымі, кім былі ўсё жыццё, а зрабіліся нелюдзямі, звяр'ём, падуладным только гэтым набрыдам-немцам, тады як разумець тое?" [1, с. 184]. Вайна стала часам, калі здрада зрабілася частай з'явай, калі свае ператварыліся ў чужых, у звяр'ё, у тых, хто гатовы на ўсё дзеля помсты, дзеля захавання ўласнага жыцця, зусім забыўшыся на чалавечнасць.

## Бібліяграфічны спіс


1. Быкаў, В. Знак бяды : аповесць / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 254 с.
2. Заяц, Н. В. Быкаў Васіль [Электронны рэсурс] / Н. В. Заяц // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: В. У. Ваніна (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – Т. 8 : Беларус. літ. – С. 201–206. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/49229. – Дата доступу: 19.12.2021.